Таким образом, в обозначенный период в журнале «Военный сборник» печатались статьи не только по вопросам стратегии и тактики, военной статистики, артиллерии, топографии и фортификации, но также касающиеся актуальных проблем военной юстиции, в связи с чем он является ценным источником для изучения не только военной истории в целом, но и различных аспектов деятельности военно-судебных учреждений на территории белорусских губерний Виленского военного округа во второй половине XIX – начале XX веков.


1. Военный сборник. Официальный сайт [Электронный ресурс]. – Режим доступа:http://ejournal6.com.– Дата доступа: 01.03.2019.
2. Бескровный, Л. Г. Очерки по источниковедению военной истории России / Л. Г. Бескровный. – М. : Издательство Академии наук СССР, 1957. – 454 с.
3. Национальная библиотека Беларуси. Электронный каталог [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://e-catalog.nlb.by/Collection/BY-NLB-br0000299489/Collection List#holdings. – Дата доступа: 01.03.2019.
4. Военный сборник. Год пятнадцатый. Декабрь. – 1872. – № 11–12. – С. 198–200.
5. Военный сборник. Год четырнадцатый. Декабрь. – 1871. – № 12. – С. 172.
6. Военный сборник. Год пятьдесят первый. Октябрь. – 1908. – № 10. –С. 286–288.
7. Военный сборник. Год девятый. Август. – 1866. – № 8. – С. 88.
8. Военный сборник. Год сорок четвертый. Июль. – 1901. – № 7. –С. 14–28.
9. Военный сборник. Год сорок четвертый. Ноябрь. – 1901. – № 11. – С. 19–27.


**Лебедзева І.В.**

## ПІСЬМОВЫЯ КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ДЗЯЦІНСТВА Ў БЕЛАРУСІ Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XIX – ПАЧАТКУ XX СТ.

У апошнія дзесяцігоддзі адбываецца трансфармацыя падыходаў да вывучэння такога сацыяльнага феномена як дзяцінства. Паводле навейшых даследаванняў дзеці з’яўляюцца не толькі аб’ектамі ўздзеяння дарослых, яны аказваюць адпаведны уплыў на фарміраванне светапогляду, псіхалагічных характарыстык, паводзінаў дарослага чалавека, яго сацыялізацыю і месца ў грамадскім жыцці. Аднак, па ранейшаму, і сам тэрмін «дзяцінства», яго змест і эвалюцыя ў гуманітарыстыцы і прыродазнаўчых навуках застаюцца недастаткова акрэсленымі. Патрабуе свайго асэнсавання праблема дзяцінства як адзінства біялагічнага і сацыяльнага, узростаў дзяцінства, лзіцяга свету як гістарычнай рэальнасці, як міфа, як сацыяльнага і ідэалагічнага канструкта.

Паглыбленне ў гісторыю такога сацыяльнага феномена, як дзяцінства, дапамагае зразумець сучасны комплекс сацыяльных узаемаадносін, удасканаліць сістэму выхавацця і адаптацыі дзяцей у сучасным свеце. Дзяржаўная палітыка мае патрэбу грунтавацца на комплексным міждысцыплінарным веданні пра сталенне і станаўленні маладога пакалення. Гэта акрэсліла штуршок для гістарычнай ювеналогіі. Урэшце, ювеналогія, як гуманітарная навука, арганічна аб’ядноўвае грамадска- і прыродазнаўчыя веды пра дзяцей і моладзь, аб станаўленні, сталенні і развіцці чалавека ў дыялектычным адзінстве сацыяльнага, духоўнага і біялагічных пачаткаў, якія базуюцца на агульнасці працэсаў выхавання, адукацыі і сацыялізацыі моладзі ў мэтах стратэгічнага развіцця на доўгатэрміновую перспектыву [1, с. 3-63].

Перыяд айчыннай гісторыі другой паловы XIX – пачатку XX ст. асабліва цікавы для вывучэння праблематыкі дзяцінства. Правядзенне рэформаў 60-80–х гг. XIX ст. на тэрыторыі Беларусі паклала пачатак складаным і шмат у чым супярэчлівым працэсам трансфармацыі грамадства, якія закранулі ўсе сферы чалавечага жыцця і паводзін, выклікалі шматгранныя працэсы урбанізацыі, дыферэнцыяцыі, пашырэння сацыяльнай і тэрытарыяльнай мабільнасці насельніцтва, росту пісьменнасці і адукацыі, а таксама сацыяльнай актыўнасці насельніцтва [2, с. 3]. У сувязі з імклівымі працэсамі трансфармацыі беларускага грамадства, у другой паловы XIX – пачатку XX ст з’явілася разгалінаваная сістэма заканадаўчых, нарматыўных, статыстычных дакументаў, звязаных з прававым становішчам дзяцей, юрыдычнымі адносінамі паміж бацькамі і дзецьмі, рухам насельніцтва, дзейнасцю Рамесных Статутаў на тэрыторыі Беларусі.

Важнейшымі для разумення уздзеяння грамадства на дзяцей і дзяцінства э’яўляюцца дакументальныя матэрыялы. Цэлы комплекс неацэнных звестак для характарыстыкі сацыяльна-прававога становішча дзяцей прадстаўлены ў заканадаўчых і нарматыўных дакументах. Сярод іх Улажэнне аб



Репозиторий ВГУ

пакараннях, Звод законаў грамадзянскіх, Звод законаў аб станах, законы, прысвечаныя юрыдычным адносінам паміж бацькамі і дзецьмі, становішчу дзяцей у грамадстве [3]. Акрамя таго прававое становішча дзяцей акрэслена ў «высочайше утверждённых» меркаваннях Дзяржаўнага Савета, звязаных з дзейнасцю вучэбных і папраўчых устаноў, прафесійных школ і прыютаў.

Каштоўныя і разнастайныя звесткі аб становішчы дзяцей у сем’ях, лёсе прыёмных дзяцей, выдачы грашовай дапамогі дзецям, якія засталіся без кармільца, ці сіратамі прадстаўляюць справаводныя дакументы. Сярод іх асаблівае месца займаюць справаздачы, інструкцыі па пытаннях дзейнасці дзіцячых устаноў, палажэнні, даведачныя матэрыялы, распараджэнні, статуты, справаздачы, розны тэматыкі перапіска і інш. Цэлы комплекс важных крыніц прадстаўляюць дакументы канцылярый грамадзянскіх губернатараў віленскага, мінскага, віцебскага, магілёўскага і гродзенскага. У прашэннях, скаргах, зваротах грамадзян, перапісцы дзяржаўных органаў змяшчаецца інфармацыя, якая дазваляе зрабіць высновы аб стаўленні да дзяцей бацькоў, апекуноў, органаў дзяржаўнай улады [4]. Разнастайная інфармацыя аб працы дзіцячых прыютаў, становішчы здароўя і харчавання, занятках размешчаных там дзяцей у форме рэскрыптаў, цыркуляраў, перапіскі розны тэматыкі, справаздач аб дзейнасці і матэрыяльным становішчы знаходзіцца ў дакументах прыказаў губернскіх апекаў дзіцячых прыютаў [5].

Вывучэнне дадзеных статыстыкі дазваляе прасачыць змены ў эканамічным, сацыяльным становішчы дзяцей, падыходах да выхавання, зрабіць аналіз дэмаграфічнага змен сярод малодшых узроставых груп у Беларусі. Актыўная дзейнасць статыстычных устаноў у Расійскай імперыі была абумоўлена імклівымі працэсамі сацыяльна-эканамічных і палітычных зменаў у грамадстве, якія акрэсліліся на падставе рэформаў 60-х гг. XIX ст. Да гэтага ў дзяржаве існавалі такія дакументы фіскальнага ўліку насельніцтва, як рэвізіі, адміністрацыйна-паліцэйскі ўлік, матэрыялы Генеральнага межавання і інш. Важным бачацца дадзеныя дэмаграфічнай статыстыкі – звесткі аб грамадзянах па ўзросту, сямейным становішчы, адукацыі, полу, паходжанні, руху насельніцтва [6]. Істотным для разумення пошукаў шляхоў вырашэння найскладанейшых праблем аховы дзяцінства з’яўляецца даследаванне Цэнтральнага Статыстычнага Камітэта аб дзіцячай смяротнасці ад нараджэння да 1 года. Тут утрымліваюцца статыстычныя даныя аб стане дзіцячай смяротнасці ў еўрапейскіх краінах і ў спалучэнні з імі дакладныя звесткі па губернях Расійскай імперыі [7].

Прыярытэт відаў крыніц па значнасці змяняецца ў залежнасці ад пастаўленых даследчыкам задач: калі першараднай даследчай праблемай з’яўляецца праблема канструявання гісторыі дзяцінства звонку, пад уплывам знешніх фактараў, то прыярытэт, безумоўна, павінен быць аддадзены дакументам афіцыйнага паходжання. Але варта разумець тое, што жыццё дзіцячага свету адносна аўтаномнае. У ім прысутнічае іншая логіка і дзейнічаюць свае практыкі, якія, хоць і моцна залежныя ад «уладных» і проста «дарослых» рашэнняў, але прыўносяць у іх і шмат свайго, насычаюць іх досведамі сваіх «маленькіх дзіцячых жыццяў». Таму не менш значнымі для вывучэння праблематыкі гісторыі дзяцінства апавядальныя крыніцы.

Створаныя дзецьмі крыніцы значна больш каштоўныя з пункту гледжання таго, што яны даюць магчымасць зірнуць на вядомыя гістарычныя падзеі з цалкам арыгінальнага пункту гледжання, прыслухацца да адкрытых меркаванняў дзяцей, шмат у чым адрозных ад стэрэатыпных ацэнак дарослых. Гэтыя крыніцы ўзбагачаюць нашу гісторыю новымі сюжэтамі, новымі тыпажамі, новымі падзеямі, якія не знайшлі адлюстравання ў дакументах «дарослага» паходжання. Зразумела, што самыя дзеці даследуемага перыяду на тэрыторыі Беларусі амаль не дакументавалі сваё жыццё. Існуюць найперш успаміны дарослых, якія дазваляюць зразумець развіццё дзяцінства ў канкрэтных гістарычных умовах, для вызначанай сацыяльнай групы. Зразумела, што да таго часу, калі дзеці аказваюцца ў стане даваць сабе справаздачу ў сваіх словах, яны ўжо не з’яўляюцца дзецьмі, і іх мемуары адлюстроўваюць з гэтага часу як дзіцячыя, так і дарослыя тлумачэнні і эмоцыі. Прыкладам такой крыніцы з’яўляюцца ўспаміны аб сваім дзяцінстве знакамітага вучонага-краязнаўцы, этнографа і археолага Е. Р. Раманава [8].

Для вывучэння гісторыі дзяцінства невычарпальнай крыніцай з’яўляецца перыядычны друк, які ў Беларусі, з-за адсутнасці дэмакратычных інстытутаў, меў асаблівае значэнне. З аднаго боку ён павінен быў фарміраваць грамадскую думку, а з другога – з’яўляцца месцам яе выяўлення. У беларускіх губернях перыядычны друк быў прадстаўлены афіцыйнымі і неафіцыйнымі

Рэпазіторый ВДУ

выданнямі. У залежнасці ад зместу адлюстраванне дзіцячых праблем было прадстаўлена ў кожным з іх. Асноўныя пытанні, якія звычайна абмяркоўваліся на старонках перыядычнага друку, ахоплівалі праблемы выхавання, дабрачыннасці, злачыннасці, самагубстваў, сіроцтва, прастытуцыі малалетніх і інш. Сярод афіцыйных, у першую чаргу, неабходна адзначыць губернскія ведамасці. Гэтыя газеты рэдагаваліся дзяржаўнымі чыноўнікамі, друкаваліся ў дзяржаўных губернскіх друкарнях і, адпаведна, змяшчалі афіцыйную інфармацыю.. Каб зменшыць ўплыў маштабнага працэсу міфатворчасці са сваімі мэтамі і задачамі, неабходна заўсёды ўлічваць накірунак выдання, уплыў афіцыйных і неафіцыйных структур.

Значнай падзеяй для грамадскасці Беларусі з'явіўся выхад з газеты "Минский листок", якая называла сябе грамадска-літаратурнай. Газета з'явілася сапраўдным рупарам праблем грамадскасці, і ў прыватнасці, шматлікіх пытанняў па ахове дзяцінства. У шэрагу перыядычных выданняў, прысвечаных непасрэдна праблемам дзяцей, можна адзначыць часопіс "Вестник благотворительности", які выдаваўся з 1897 г. па 1902 г. і быў цалкам прысвечаны вырашэнню праблем уладкавання дзіцячых прыютаў і багадзельняў [9]. Першым беларускамоўным перыядычным выданнем у Беларусі была газета "Наша ніва", якая змяшчала інфармацыю аб паўсядзённым жыцці беларускіх сем'яў, аб стане адукацыі, вершы, казкі беларускіх паэтаў, фальклорныя творы, прысвечаныя дзецям.

Вывучэнне гісторыі дзяцінства сутыкаецца з шэрагам розных важных праблем. Пісьмовыя крыніцы па гісторыі дзяцінства, можна на падставе іх паходжання падзяліць на крыніцы пра дзяцінства (успаміны, лісты, перыёдыка, дакументы і інш.), створаныя дарослымі, і непасрэдна дзіцячыя крыніцы –тэксты, спароджаныя самімі дзецьмі. Дзіцячыя пісьмовыя тэксты малалікія па вызначэнні, бо дзіця часцей выказвае сябе ў вусных альбо невербальных зносінах. Вялікае значэнне таму набываюць пісьмовыя крыніцы іншага, «дарослага» тыпу, прычым не толькі ўспаміны аб дзяцінстве, але і крыніцы, створаныя ў працэсе вербальных і невербальных зносін з дзіцем, у тым ліку кіно-і фотадакументы, малюнкі і ўзоры мастацкага афармлення прасторы, бытавыя прадметы і, вядома ж, цацкі. Прымяненне шматлікіх крыніц, розных па відах і тэматыцы, да вывучэння дзяцінства ў беларускім грамадстве, звяртанне як да сусвету дзяцей і дзяцінства, так і да сусвету дарослага грамадства больш поўна асэнсаваць развіццё беларускага грамадства ў другой палове XIX – пачатку XX ст.


1. Мещеркина Е. Ю, Нуркова о детстве как объект междисциплинарных исследований // Вестник УРАО. – 2003. – № 2. – С. 3–63.
2. Каханоўскі, А. Г. Сацыяльная трансфармацыя беларускага грамадства (1861-1914 гг.) / А. Г. Каханоўскі. – Мінск : БДУ, 2013. – 335 с. С. 3.
3. Законы о детях. Сборник постановлений действующего законодательства, относящихся до малолетних и несовершеннолетних с приложением Свода разъяснений по кассационным решениям Сената / Сост. Я. А. Канторович. СПб. : Тип. М. М. Стасюлевича, 1899; Охрана детства / Сост. В. М. Сорокин. СПб. :1893.
4. Приказы по городским полициям // НГАБ. – Ф. 295. – Воп. 1. – Спр. 9490/
5. Могилевский приют // НГАБ. – Ф. 3247. – Воп. 1. – Спр. 1.
6. Движение населения в Европейской России за 1885 год. Издание Центрального Статистического Комитета Министерства Внутренних Дел / СПб. : Тип. МВД. – 1890. – 211 с.; Движение населения в Европейской России за 1886 год. Издание Центрального Статистического Комитета Министерства Внутренних Дел / СПб. : Тип. МВД. – 1890. – 211 с.; Движение населения в Европейской России за 1887 год. Издание Центрального Статистического Комитета Министерства Внутренних Дел /СПб. : Тип. В. И. Штейн. – 1891. – 211 с.; Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 года / Изд. Центральным Статистическим комитетом МВД: Под ред. А. А. Тройницкого. – [СПб.], 1897–1905.
7. Смертность младенцев в Европейской России в 1867–1881 гг. Издание ЦСК МВД / СПб. : 1889. – 17 с.; Смертность младенцев в возрасте от рождения до одного года в 1909, 1910 и 1911 годах в Европейской России / СПб. : Тип. Штаба войск Гвардии и Пет. Воен.округа. – 1914. – 100 с.; Смертность младенцев в возрасте от рождения до одного года в 1912 г. в Европейской России / Петроград : 1918. – 62 с.
8. Бандарчык В. К. Еўдакім Раманавіч Раманаў / В. К. Бандарчык. – Мінск : Выд-ва Акадэміі навук БССР, 1961. – 304 с.
9. Вестник благотворительности. – 1902. – № 4; Вестник благотворительности. – 1902. – № 9.


Репозиторий БГУ